# ДАСКАНАЛЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЛАД ВА УЯЎЛЕННЯХ АЙЧЫННЫХ АЎТАРАЎ-ПАЛЕМІСТАЎ К. XVI – ПАЧ. XVII СТСТ.

**Р. С. Пашкевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, paszkiewiczjafiet@gmail.com;*
*Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных наук, дацэнт Л. А. Гедзімін*

Грунтуючыся на аналізе твораў палемічнай літаратуры Барока, былі вызначаны палітычныя перакананні, светапоглядныя канстанты і ўяўленні пра ідэальную дзяржаву Пятра Скаргі і Мелецція Сматрыцкага як найбольш выразных прадстаўнікоў розных канцэпцый дзяржаўнага развіцця на землях ВКЛ.

***Ключавыя словы:*** палемічная літаратура Барока; Пётр Скарга; Мелецій Сматрыцкі; палітычная філасофія; польскамоўная літаратура Беларусі; рэлігійная літаратура.

# ИДЕАЛЬНЫЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ СТРОЙ В ПРЕДСТАВЛЕНИЯХ ОТЕЧЕСТВЕННЫХ АВТОРОВ-ПОЛЕМИСТОВ К. XVI – НАЧ. XVII ВВ.

**Р. С. Пашкевич**

*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, paszkiewiczjafiet@gmail.com;*
*Научный руководитель – кандидат филологических наук, доцент Л. А. Гедимин*

Основываясь на анализе произведений полемической литературы Барокко, были определены политические убеждения, мировоззренческие константы и представления об идеальном государстве Петра Скарга и Мелетия Смотрицкого как наиболее выразительных представителей различных концепций государственного развития на землях ВКЛ.

***Ключевые слова:*** полемическая литература Барокко; Пётр Скарга; Мелетий Смотрицкий; политическая философия; польскоязычная литература Беларуси; религиозная литература.

# PERFECT STATE ORDER IN THE IDEAS OF NATIVE AUTHORS-POLEMISTS OF THE XVI CENTURY – BEGINNING. XVII STST.

**R. Paszkiewicz**

*Belarusian State University,*
*4, Independence Ave, 220030, Minsk, Belarus, paszkiewiczjafiet@gmail.com;*
*Supervisor – PhD, Ass. Professor L. A. Gedimin*

Based on the analysis of the works of polemical literature of the Baroque period, the political beliefs, worldview constants and ideas about the ideal state of Piotr Skarga and Meletiusz Smotrycki,

as the most expressive representatives of various concepts of state development in the lands of the Grand Duchy of Lithuania.

***Keywords:*** Baroque polemical literature; Piotr Skarga; Meletiusz Smotrycki; political philosophy; Polish-language literature of Belarus; religious literature.

Праблема ідэальнага дзяржаваўладкавання непарыўна звязана з развіццём філасофскай думкі з антычных часоў. Менавіта да гэтай спадчыны звярталіся філосафы і тэолагі ў пазнейшыя часы. У хрысціянскай Еўропе, шмат у чым намаганнямі св. Тамаша Аквінскага, асаблівым аўтарытэтам карысталася філасофія Арыстоцеля, якая была прынята за ўзор разважанняў. За стагоддзі філосафы стварылі мноства мадэляў дзяржавы, частка з якіх была выпрабавана на трываласць часам, а іншыя існавалі толькі ў якасці тэарытычных абстракцый.

Дзяржава – адзін з найважнейшых інстытутаў чалавечай арганізацыі, таму і пытанне пра яе лад закранала адразу некалькі сфер жыццёвай дзейнасці: філосафы разважалі пра прынцып улады, пра законы, іх выкананне і паходжанне, перавагі той ці іншай формы кіравання, лаялізм і паўстанне, суадносіны свецкай і рэлігійнай улады. Усебакова разглядалі гэтыя патынні сярэднявечныя тэолагі (свв. Аквінат, Аўгустын, Бернард Клеўроскі, Пётр Даміані, Грыгорый VII і інш.). Яны ўтварылі своеасаблівы кансэнсус, які грунтаваўся на філасофіі арыстоцелізму і біблійным падмурку, а таксама святаайцоўскім вучэнні. Нягледзячы на добрараспрацаваную тэорыю, кожная гістарычная эпоха ставіла перад чалавецтвам новыя выклікі.

У XVI стагоддзі з пачаткам Рэфармацыі Еўропу паглынуў працяглы рэлігійны канфлікт, які не абыйшоў і ВКЛ. Рух за рэлігійныя змены пачаў імкнуцца і да палітычнай трансфармацыі [2, с. 111]. Так, кальвініст Андрэй Валян нават не згадвае духоўнае саслоўе ў сваім трактаце «Аб грамадзянскай свабодзе…». Аднак пасля Трыдэнцкага сабору (1545–1563 гг.) у палітычнай тэорыі паўстаў кантррэфармацыйны дыскурс, у межах якога тэолагі адаптавалі сярэднявечныя канцэпцыі пад актуальныя рэаліі. Найбольшым аўтарытэтам у гэты перыяд карыстаўся Роберт Белармін, пазней кананізаваны; менавіта яго вучэнне распаўсюдзілася сярод каталіцкіх аўтараў, у тым ліку айчынных. Напрыклад, даследчыкі (Я. Тазбір, С. Віндакевіч) адзначаюць уплыў тэалогіі і палітычнай філасофіі Беларміна на апалагета каталіцтва Пятра Скаргу, які імкнуўся прымяніць гэтае вучэнне на практыцы ў культурнай прасторы Рэчы Паспалітай. Паводле Януша Тазбіра, палітычную праграму Скаргі можна апісаць як клерыкалізм з тэндэнцыямі да абсалютызму. У каталіцкай палітычнай думцы існаваў і іншы кірунак, да якога належалі прадстаўнікі біскупату, якія выступалі за пашырэнне паўнамоцтваў Сената, апелюючы да арыстоцелеўскай арыстакратыі [10, с. 51].

Заўважым, з самага пачатку свайго існавання Рэч Паспалітая не была аднароднай ні палітычна, чаму спрыялі яе канфедэрацыйны характар, абмежаваная каралеўская улада, шырокія прывелеі шляхецкага саслоўя; ні рэлігійна: нягледзячы на некалькі спроб рэалізацыі пастаноў Ферара-Фларэнтыйскага сабора аб уніі, у XVI стагоддзі Кіеўская мітраполія (у тагачаснай тэрміналогіі Руская Царква) дзейнічала незалежна

ад Папскай сталіцы, сярод шляхты і мяшчанства актыўна распаўсюджваўся пратэстантызм, а свабода веравызнання была замацавана заканадаўча. У такіх умовах на землях усёй Рэчы Паспалітай пачала з'яўляцца палемічная літаратура, у якой палітычнае часта падавалася непадзельна ад рэлігійнага. Прадстаўнікі ўсіх бакоў канфлікту сцвярджалі свой патрыятызм, адданасць рэлігійным і этнічным традыцыям ВКЛ, у духу сарматызму апелявалі да «слаўных продкаў» і шляхецкага этасу. На гэта ўплывала атмасфера своеасаблівай палітычнай культуры польскай арыстакратыі, для якой была характэрна ідэалізацыя «залатых вольнасцяў» і прынцыпаў шляхецкай дэмакратыі. Па-за рэлігійнай палемікай ідэолагамі сарматызму дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай прызнаваўся дасканалым. «Сарматысты» грунтавалі свае меркаванне на палітычнай тэорыі арыстоцелізму, якая абвяшчала тры вартыя формы дзяржаўнага ладу: манархію, арыстакратыю і палітэю; у сваю чаргу, Рэч Паспаліта нібыта сумяшчала найлепшыя рысы гэтых форм. Падобную ідэю можна параўнаць з уяўленнямі Цыцэрона пра Рымскую рэспубліку, творы якога друкавалі ў Рэчы Паспалітай польскай і лацінскай мовамі.

Першапачаткова падобныя ідэі падзялялі і антыўніяцкія палемісты, асабліва з атачэння «абаронцы праваслаўя» князя Канстанціна Астрожскага, аднак пасля смерці апошняга ў якасьці новага абаронца праваслаўя пачало ўспрымацца казацтва. У сувязі з гэтым паказальна гісторыясофская канцэпцыя праваслаўнага манаха Захарыі Капысценскага: ён будуе ідэнтычнасць казацкага праваслаўя на супрацьпастаўленні Рыма і Канстанцінопаля, адмаўляючы традыцыйную для ўсходняй Царквы эклезіялогію, паводле якой апостал Пётр і яго наступнікі былі першымі па гонары, але не па ўладзе. У трактаце «*Палінодыя…*» Капысценскім быў пераапрацаваны сармацкі міф: паводле яго, сарматы гэта «*продкі нашы Роскія*», якія рыцарскі ваявалі супраць рымлян, «*и завше той народ яфето-россkій славенскій был неусмиреній и вольній и незголдованій*» [1, с. 498]. Капысценскі за сармацкі ідэал успрымае быт казацкага войска, шануе казакоў за абарону праваслаўя. На прыкладзе аўтара «*Палінодыі…*» бачна, што частка інтэлектуалаў неўніяцкай Кіеўскай мітраполіі не лічыла неабходным заставацца вернымі Рэчы Паспалітай: нягледзячы на сваю індактрынаванасць сарматызмам, яны не жадалі звязваць свой лёс з Польшчай. Захарыя сцвярджае, што праваслаўным лепей у Порце: «*Хто был в Константинополю… обачил бы свободу… и безпеченство христіан таковоє, же рекл бы кождый, иж там христіане царствуют… толко цара не доставает*» [1, с. 641].

Аднак ў эпоху Барока на першы план выходзіць патрыятызм, калі такія заявы адмоўна ўспрымаліся нават праваслаўнымі. Абвінавачванне ў здрадзе становіцца элементам ідэйнай барацьбы. Прычынай недаверу станавілася тое, што ўсе праваслаўныя патрыярхі былі падданымі асманскага султана – суперніка Рэчы Паспалітай. Некаторыя палемісты імкнуліся падцвердзіць патрыятызм. Так, баронячы вернасць праваслаўных сваёй Айчыне, архіепіскап Мялецій Сматрыцкі ў «*Verificatii niewinności*» (1621) абураецца, што «*nas zdraycami oyczyzny y szpiegami Tureckimi szkaluią*» і адмаўляе, што «*Borecki y Smotrzisky… z cesarsem Tureckim zrozumiawszy się, pod praetextem relligiey y nabożeństwa, bunty y roztyrki szkodliwe czynili*» [4, с. 398].

Такім чынам, сярод як каталіцкіх, так і часткі праваслаўных палемістаў захаванне Рэчы Паспалітай прызнавалася за неабходнасць. Аднак адносна яе будучыні існавалі розныя меркаванні. Найбольш выразна розныя канцэпцыі грамадзянска-палітычнага ладу можна ўбачыць на прыкладзе твораў каталіцкага тэолага Пятра Скаргі і праваслаўнага (пазней уніяцкага) апалагета Мелеція Сматрыцкага.

У сваёй творчасці Пётр Скарга закранае розныя пытанні: у некаторых тэалагічных працах уздымаюцца палітычныя і сацыяльныя праблемы, Скарга вызначае шляхі іх вырашэння ў рэчаіснасці мяжы XVI–XVII стст. на землях Рэчы Паспалітай. Да такіх твораў можна аднесці: «*O jedności Kościoła Bożego…*», «*Upominanie do ewangelików*», «*Proces konfoederatiey*», «*Kazania sejmowe*», «*Dyskurs na konfederacyą*», «*Wzywanie do pokuty…*», «*Na threny y lament… przestroga*» і інш. Асобна адзначым «Сеймавыя казанні», бо менавіта ў іх айцец-езуіт падрабязна апісвае свае бачанне хрысціянскай дзяржавы, яе грамадзянскага ўладкавання, крытыкуе сацыяльныя рэаліі Рэчы Паспалітай, вызначае шэсць «хвароб» гэтай дзяржавы. Больш сцісла Пётр Скарга апісвае дасканалае дзяржаваўладкаванне ў трактаце «*Na threny y lament..* ». Гэты трактат, як і «*Wzywanie do pokuty…*», з'яўляюцца своеасаблівым падсумаваннем ідэй аўтара, напісаныя напрыканцы яго жыцця.

Заўважны манархічныя сімпатыі Пятра Скаргі «*Przyrodzony sposób jest w ciele, aby jedna głowa rządziła: tak też w rzpltej przyrodzona i nalepsza i nawłaśniejsza rozumowi ludzkiemu jest monarchia abo jedynowładztwo i rząd jednego, który gdy się mieni a na wiele się głów dzieli, ciężka jest i śmiertelna rzpltej choroba*» [7, c. 14], больш таго, паводле Скаргі, манархія з'яўляецца адлюстраваннем Боскага парадку: кароль кіруе дзяржавай падобным чынам, як сам Бог кіруе сусветам. Гісторыя, паводле Скаргі, наканавана Богам: ні каралеўства, ні рэспублікі *bez Boskiej pomocy fundować się i stać i obrony mieć nie mogą.*

Каб давесці сваю пазіцыю, Скарга апелюе да антычных філосафаў, святых айцоў і Бібліі; звяртаецца да гістарычных сведчанняў. Палеміст сцвярджае неабходнасць моцнай каралеўскай улады, якая не будзе абмежавана сеймам. Крытыкуючы сеймавую сістэму, ён піша: *Gdzie wszyscy równi, tam żaden rząd być nie może… Między pospólstwem więcej głupich, niżli mądrych, i na głupi, co jest przeciw przyrodzeniu, rząd przychodzi* [5, c. 98]. Скарга папракае шляхту за адыход ад веры, невыкананне рыцарскіх абавязкаў, чыненне «звады і нязгоды», перашкоду працы сейма. Разам з тым манархія супрацьпастаўлена тыраніі: *Nie taką monarchią chwalimy, jaka jest u Turków, Tatar i Moskwy, która ma bezprawne panowanie, ale taką, która prawy sprawiedliwemi i radą mądrą podparta jest i moc swoje ustawami pobożnemi umiarkowaną i okreszoną ma* [7, c. 51]. Скарга фактычна паўтарае тэзіс св. Аўгустына пра тое, што дзяржавы, якія не прытрымліваюцца сваіх законаў, з'яўляюцца разбойнымі бандамі. Акрамя таго, для Пятра Скаргі важна не толькі законнасць улады, але і справядлівасць яе законаў: *a iż królowie i rzplte mają moc stanowić sobie prawa, pismo samo świadczy…«Przez mię królowie królują i zakonodawce sprawiedliwie skazują». I to, co rzekł Izajasz: «Biada tym, którzy niesprawiedliwe prawa stawią».* ***A jeśliż takim biada, tedy tym, którzy dobre i sprawiedliwe prawa stawią, jest błogosławieństwo*** [7, c. 14].

Скарга падкрэслівае, што крыніцай дзяржаўнага права з'яўляецца воля караля, якая павінна быць узгаднена з Боскім, натуральным і звычаёвым правам. Дзяржава павінна абараняць хрысціянскія каштоўнасці і саму каталіцкую рэлігію. У сувязі з гэтым крытыкуецца прававая сітуацыя ў Рэчы Паспалітай: *Grzechy się też rozkwitnęły…: cudzołostwa, kazirodztwa, lichwy, czary i inne, które wedle praw starych i świętych duchowny sąd karał, które teraz szerzą się, a pomsty samego Boga rychłej i srogiej czekają* [7, с. 41]. Але яшчэ горшым нават ад грахоў, якія «выклікаюць помсту з неба», Скарга называе заканадаўча замацаваную свабоду веравызнання: *jeszcze gorsze, które konfederacyą zowiecie roku pańs. 1573… aby każdemu wolno było wiarę sobie, jaką chce mieć… odmiany w kościele czynić... Jeszcze większą ma niesprawiedliwość i większe za sobą przeklęctwo Boskie ciągnie to prawo… [ciągnie] swowolność i bluźnienia… i wykorzenianie wiary… i szczepienie ateizmu* [7, с. 42].

Але, паводле Пятра Скаргі, нельга гвалтам вымушаць змяніць веру, бо «хаця і дрэнная ерась, добрыя суседзі і браты», пра гэта ён пісаў ва ўступе «*Na threny…*», паўтараючы вывады з «*Upominania…*» [8, с. 72].

Каталіцкі прапаведнік, наследуючы інтэлектуальнай традыцыі свв. Пятра Даміані, Грыгорыя VII і Аквіната, сцвярджае прыярытэт духоўнай улады над свецкай. Паводле Пятра Скаргі, *religia i kapłaństwo fundamentem jest królestw u ludzi Boga prawego* [7, с. 48]. Задача дзяржавы – абараняць каталіцкую веру, нават сам кароль, хаця і павінны быць адзіным уладцам, усё ж мае абавязкі перад Касцёлам, *bo każdy król chrześcijański koronę swoje, i miecz, i moc królewską* ***od Chrystusa przez kapłana jego*** *bierze; i nigdy doskonałym królem nie jest, póki* ***koronowany od kapłana*** *nie bywa* [7, с. 49]. Каталіцкі палеміст абазначае ролю святарства ў дзяржаве: гэтае саслоўе вучыць і захоўвае каралеўства ў веры. Усе іншыя саслоўі (Скарга выдзяляе пяць: духавенства, рыцарства, сенатарства, машчанства і сялянства) павінны выконваць свае абавязкі, тады дзяржава ўтварае адзіны арганізм, які існуе для агульнага дабра. Скарга падкрэслівае важнасць міжсаслоўнай згоды, знаходжання на сваім месцы, цытуе св. Аўгустына: iż głupi nie mogą szczęśliwiej żyć, jedno gdy mądrych słuchają a im służą.

У пэўным антаганізме да палітычнай пазіцыі Пятра Скаргі знаходзіцца Мялецій Сматрыцкі. Значная частка таго інтэлектуальнага кола, якое сфармавалася вакол астрожскіх школ, прытрымлівалася агульных для шляхты канцэпцый шляхецкай рэспублікі залатых вольнасцяў. Для валынскага шляхціча Максіма Сматрыцкага гэта таксама было натуральна. Разам з тым заўважна, што палітычныя пытанні не займаюць шмат месца ў творчасці праваслаўнага палеміста, у адрозненні ад Скаргі, няма ў яго і трактатаў, у якіх усебакова разглядаецца палітычная тэорыя. Тым не менш, у сваіх палемічных творах ён закранае ролю шляхты ў кіраўніцтве дзяржавай і яе ўплыў на духоўнае жыццё ўсёй краіны. А ў позніх творах нават прадпісвае, што неабходна зрабіць, каб дасягнуць грамадзянскага дабра. У творы «Threnas to jest lament…» Мялецій Сматрыцкі пад імем Тэафіла Арталога абвінавачвае русінаў у адпадзенні ад Маці-Царквы, адрасуючы свой «плач» шляхце, заклікаючы яе да вяртання ў праваслаўе. Менавіта шляхта з'яўляецца для Сматрыцкага дзеючай сілай гісторыі: згадваючы праваслаўных шляхецкіх продкаў грэка-каталіцкага біскупа Іпація Пацея,

ён заклікае таго быць верным іх перакананням. У гэтым творы Мялецій Сматрыцкі рэзка адмоўна ставіцца да Каталіцкага касцёла, называе яго ератычным. Аднак пазней Мялецій Сматрыцкі неаднаразова ўхвальна апісваў свабоду вызнання веры ў Рэчы Паспалітай. У «Weryfikacji niewinności» і «Obronie Weryfikacji» Мялецій Сматрыцкі апраўдвае існаванне неўніяцкай Кіеўскай мітраполіі і законнасць яе іерархіі, якую аднавіў ерусалімскі патрыярх Тэафан III. Ён адкідвае абвінавачванні ў шпіянажы на карысць Порты і сцвярджае, што Тэафан нават заклікаў казакоў ваяваць супраць туркаў за караля Рэчы Паспалітай. У гэтых творах полацкі епіскап дастаткова адназначна заяўляе, што галоўны вораг усіх хрысціян – Асманская імперыя, для барацьбы з якой неабходна грамадзянскае адзінства, супольная праца ўсіх саслоўяў, згода ў дзяржаве. Крытыка ўніі з тэалагічнай змяшчаецца на палітычную: Сматрыцкі абінавачвае прыхільнікаў уніі ў парушэнні сацыльнага супакою, паводле «Weryfikacji niewinności» для міра ў дзяржаве на землях ВКЛ павінна быць толькі адна Руская царква, якая будзе агульнай для ўсіх русінаў, у той час як Каталіцкі касцёл аб'яданае палякаў і літвінаў. Тым не менш, Мялецій Сматрыцкі адзначае, што не вера робіць «русіна русінам, літвіна літвінам, а паляка палякам», але кроў і паходжанне [4, с. 301]. У параўнанні з больш раннімі творамі, полацкі епіскап выказваецца значна больш мякка, не абвінавачвае каталіцызм у ерасі, дапускае яго існаванне разам з праваслаўем. Акрэсліваецца роля шляхты як абаронцаў міжканфесійнага міру, шляхта павінна быць мудрымі заканадаўцамі і мужнымі воінамі. Што паказальна, Сматрыцкі прытрымліваўся амаль аднолькавых поглядаў на шляхецкае саслоўе нават пасля пераходу на бок уніі. У сваім першым уніяцікім творы «Апалогія перангрынацыі…» (1627) усё так жа абараняе ідэі ўнутрыдзяржаўнай згоды і парадку, але цяпер сцвярджае, што для таго, каб дасягнуць гэтага, неабходна спачатку прывесці народы Рэчы Паспалітай да рэлігійнага адзінства. Асобна да працы на карысць гэтага адзінства Сматрыцкі заклікае шляхту, якая павінна адмовіцца ад ерасяў, каб стаць прыкладам усяму «рускаму народу» [9, с. 31]. Менавіта на шляхту ўскладваецца абавязак абараняць не толькі межы дзяржавы, але і «веру продкаў» (для Сматрыцкага-ўніята праваслаўе і каталіцызм з'яўляюцца сінонімамі, адным вызнаннем артадаксальнай веры). Шляхта для полацкага епіскапа – найлепшае і самае шаноўнае саслоўе, якое павінна мудра кіраваць праз сеймы. Менавіта на шляхце абавязак захоўваць супакой і імкнуцца да супольнага дабра.

Агульным у палітычных перакананнях Пятра Скаргі і Мялеція Сматрыцкага неабходна прызнаць імкненне да грамадзянскага парадку, саслоўнага міру і згоды ў дзяржаве. Яны абодва наследуюць традыцыйнай арыстоцелеўска-сярэднявечнай канцэпцыі дзяржавы, якая існуе для агульнага дабра як аб'яднанне людзей аднаго паходжання. Тым не менш, у межах гэтай парадыгмы яны ствараюць розны вобраз дасканалай дзяржавы. Пётр Скарга абараняе моцную каралеўскую ўладу, якая абапіраецца на Сенат і духавенства; рыцарства ці шляхта ў яго бачанні павінна ваяваць, абараняючы ўладу і ўвесь Pax Christiana ад знешніх ворагаў. У сваю чаргу, Мялецій Сматрыцкі аддадзены ідэалам шляхецкай дэмакратыі, шляхта, паводле яго, павінна быць не толькі мужнай на вайне, але і мудрай у палітычных справах. Адносна

іншых саслоўяў палемісты прытрымліваюцца тамісцкага пераканання, што ўсе павінны знаходзіцца на сваім месцы і выконваць сваю ролю.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Капустенскій, З. Палінодія // Русская Историческая Библиотека: в 39 т. СПб., 1872–1927. Т. 4. С. 313–1200.
2. Кароткі У. Г. «Третий Рим» и «Второй Константинополь»: проблема иерархии в церковно-полеми-ческой литературе восточных славян // Сравнительное литературоведение: теоретический и исторический аспекты: Мат-лы Междунар. научной конференции. М., 2003. С. 111.
3. Кароткі У. Творчы шлях Мялеція Сматрыцкага Мінск: Навука і тэхніка, 1987. С. 42.
4. Smotrizki M. Verificatia niewinności // Архив Юго-Западной России, издаваемый комиссиею для разбора древних актов. Киев: Типография Г. Т. Корчак-Новицкого. Т. 7. Ч. 1. С. 279–344.
5. Skarga P. O rządzie i jedności Kościoła Bożego. Kraków, 1591.
6. Skarga P. Proces konfederacyjej. Kraków, 1596.
7. Skarga P. Kazania sejmowe / oprac. J. Tazbir, M. Korolko. Wrocław etc.: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1984.
8. Skarga P. Upominanie do ewangelików y do wszystkich społem nie katholików, iż o skażenie zborów Krakowskich gniewać się y nic nowego y burzliwego zaczynać nie maią. Poznań: B. Wolrobowa i dziedzice, 1592.
9. Smotrycki M. Apologia Peregrinatiey do kraiów wschodnich. Dermań, 1628.
10. Tazbir J. Piotr Skarga. Szermierz Kontrreformacj. Warszawa; Wiedza powszechna, 1983.